**11. МАКСІМАЛІСТЫ**

З Варшавы праз знаёмых Зянон Пазьняк перадаў мне кнігу вершаў. Сваіх вершаў. А калі ён піша вершы, то ўжо не жалезны Пазьняк, якім яго зрабіла дзяржаўная прапаганда, а сентыментальны Зянон, якога, на жаль, беларусы зусім не ведаюць.

Рэдкае свецкае імя пераўтварылася ў літаратурны псеўданім. На вокладцы прыгожага, аздобленага фатаграфіямі аўтара, унушальнага па памерах і фізічнай вазе тома значыцца: ″Зянон. Глёрыя Патрыя″. Кніга выдадзена ў Вільні Таварыствам беларускай культуры ў Літве. Тыраж -- 1000 асобнікаў.

″Gloria Patria″ з лацінскай мовы можна перакласці на беларускую як: ″Хвала радзіме″. Па-руску гучыць: ″Да здравствует Родина!″ Абавязкова -- з клічнікам.

У Зянона замест клічніка -- сум. Успамін па радзіме дзяцінства, мара пра будучую радзіму-ідэал, позірк на занядбалую радзіму-сучасніцу -- усё гэта паэтава душа пераплавіла ў зіхоткі, мройны, тужлівы вобраз Бацькаўшчыны.

Прыпыніся на хвілінку, заклапочаны сучаснік! Не трэба нікуды спяшацца, калі з вамі свет паэта. Прапусціце ў сябе, калі ласка, рытм верша ″Каляды майго дзяцінства″:

**Хіліцца сонца за вішнёвы сад,**
**Гурбы іскрацца ў ружовым сьвятле,**
**Ужо кладуцца праменьні на сьнег,**
**Ужо цямнее пад дрэвамі цень,**
**І бярэцца мароз -- аж трашчыць у слупах.**
**Конь у стайні захроп -- поўны цэбар з аўсом,**
**І дыхнула такім чалавечым жытлом.**
**Грубка цёплая смольна гудзіць,**
**Галасы пад вакном,**
**Дарагімі гасцямі напоўнены дом.**

Зянон працуе ў манеры, не ўласцівай беларускай паэзіі, занадта заклапочанай рыфмай і гладкапісам, а таму вельмі часта -- правінцыйнай, вучнёўскай. Вярлібр Зянона, вядома, не адкрыццё, выдатныя ўзоры яго стварылі ў нас Максім Танк і Алесь Разанаў. Але Зянон сваім свабодным вершам свядома разбурае і нясмелы беларускі гладкапіс, які занадта часта не дазваляе беларускай паэзіі сягнуть на сусветны ўзровень, і нават парушае каноны трохрадковай японскай танкі (Басё). Пераймае танку і адначасова рушыць яе форму, пашырае абсяг:

**Заходжу ў хату.**
**″Дзень добры″ кажу.**
**-- Дзень добры, -- вітае мяне гаспадар.**

**Здравствуйте, дядя, -- азваўся сынок...**
**Якое няшчасьце.**

Пазнаяце Пазьняка-палітыка? Добра, што ён хутка распазнаецца. Значыць, ён арганічны як чалавек, як асоба. Значыць, паэт, стаўшы палітыкам, не схлусіць, не абмане. Так, ён можа памыліцца. Не да месца тут гавараць аб тактычных памылках Пазьняка ў палітыцы. Скажу галоўнае: на ім няма палітычнага бруду толькі таму, што Паэт вядзе за руку Палітыка.

Прачытаўшы кнігу Зянона, я магу дакладна сказаць, за што яго паталагічна і, на першы погляд, безпадстаўна ненавідзяць дзяржаўныя чыноўнікі, былыя сябры-саратнікі па БНФ (асабліва Юрый Хадыка), многія недалёкія журналісты. Яны зайздросцяць ягонаму Таленту, ягонай душэўнай Чысціні. Каб пайсці за Пазьняком, трэба адчуць, прыняць вытокі ягонага максімалізму -- адчай па Радзіме. Але перш чым пайсці за Пазьняком, трэба пазнаёміцца з Зянонам:

**О, Вільня, як жывіш Ты маё сэрца.**
**У час спатканьня іду на пляц.**
**Вось мур,**
**Дзе апошні позірк Каліноўскага.**
**Доўга гляджу,**
**Каб панесьці з сабой у душы.**

І тут таксама -- Зянон:

**Якое сіняе неба паміж лісьця!**
**Чую сасну ў цішыні.**
**Бярозу -- на ветры.**

І тут -- Зянон, які парушае літаратурныя схемы, стварае свой жанр:

**"Ідучы пехатой па старым гасьцінцы, за ўвесь дзень не спаткаў чалавека. Тады я напісаў:**
**Нідзе ні душы.**
**Толькі машыны пыляць.**
**Сьпяваю адзін на дарозе".**

Гэта -- паэтычны і філасофскі шэдэўр. Жывапіс, створаны словам. Тут увесь Зянон Пазьняк -- паэт, палітык, чалавек. Трагічная асоба сучаснай Беларусі. Думаю, ён разумее сваю трагічнасць. Вось што ён піша на апошняй старонцы:

www.kamunikat.org

**″Гэтую кнігу фота-вершаў яшчэ ў 1995 годзе ўгаварыў мяне зрабіць пісьменьнік Уладзімір Арлоў. Ён жа паруліўся выбраць тэксты з стосу колішняй маёй пісаніны″.**

Пазьняк-палітык саромеецца паэта Зянона. Пераходзіць на калялітаратурны сленг, каб паказаць, што, маўляў, кнігу ″зрабіў″ не я, што мая ″пісаніна″ васьмідзесятых гадоў магла б ляжаць у стале.

Ды не так жа, Зянон! Я бачу, як дарагі табе кожны радок (у кнізе сапраўды сустракаюцца аднарадковыя вершы), як выверана, у сугучнай танальнасці падабраны фатаграфіі і тэксты. Каб стварыць такі спалучаны зрокавы і слоўны вобраз Радзімы, спатрэбілася шмат напружанай творчай працы.

Зянон стварыў таленавітую кнігу. Што створыць Пазьняк -- не ведаю. Хачу верыць, што Паэт і надалей, як да гэтага часу, будзе засцерагаць ад бруду Палітыка. Па сваёй дарозе Пазьняк і Зянон крочаць у адным напрамку.

Ты не адзін, Зянон! Хочацца ісці з табой побач і размаўляць па-беларуску, як умею...

2002-2005

www.kamunikat.org